*Алег Слука*
Беларускі дзяржаўны універсітэт

# Сацыяльна-палітычныя ўмовы ўзнікнення маладзёжнага друку Беларусі

На пачатку XX стагоддзя ўзмацнілася роль моладзі ў сацыяльна-палітычных працэсах грамадства. На аснове пашырэння школьнай і асабліва вышэйшай адукацыі ў многіх краінах свету пачалі ўзнікаць маладзёжныя групоўкі і арганізацыі, якія паступова ўліваліся ў агульны працэс палітычнага руху прагрэсіўных партый за дэмакратызацыю грамадства. Для культурна-асветнай працы сярод моладзі, а таксама фарміравання палітычных поглядаў падрастаючага пакалення пачалі ствараццa спецыяльныя перыядычныя выданні маладзёжных арганізацый.

У Беларусі працэс узнікнення і масавага развіцця маладзёжнага руху супадае з рэвалюцыйнымі падзеямі ў 1917 г. Пасля рэвалюцыі былі створаны масавыя камсамольская і піянерская рэспубліканскія арганізацыі, якія вялі сістэмную культурна-асветную і палітычна-прапагандысцкую працу сярод падрастаючага пакалення. Дзеля гэтых мэтаў у Беларусі была створана разгорнутая сетка маладзёжнага друку.

Сістэма арганізацыі маладзёжнага друку была абумоўлена грамадска-палітычнымі падзеямі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі. Адразу пасля рэвалюцыі, савецкая ўлада была вымушана весці несупынную барацьбу супраць нямецкіх і белапольскіх захопнікаў. У гэты час і былі створаны першыя маладзёжныя выданні, часопіс «Факел коммунизма», газета «Красная молодёжь» (1919 г.), шматлікія маладзёжныя старонкі ў партыйных выданнях, лістоўкі і адозвы, якія былі мэтанакіраваны на мабілізацыю моладзі ў Чырвоную Армію. Гэта першапачатковы перыяд узнікнення і развіцця маладзёжнага друку ў нашай краіне.

Другі перыяд пачынаецца пасля заканчэння грамадзянскай вайны і характарызуецца неабходнасцю аднаўлення мірнага жыцця, умацаваннем савецкай улады і ўключэннем у гэты працэс беларускай моладзі. У гэты час былі створаны самыя знкамітыя беларускія маладзёжныя газеты і часопісы –

«Красная смена» («Чырвоная змена» – 1921 г.), часопіс «Юный пахарь» («Малады араты» – 1922 г.), «Маладняк» – 1923 г. «Чырвоная змена» была адной з першых маладзёжных грамадска-палітычных і культурна-асветных газет на тэрыторыі Савецкага Саюза. На яе старонках у той час друкаваліся вядомыя пісьменнікі Я. Купала, Я. Колас, У. Маякоўскі і інш., якія спецыяльна пісалі для «Красной смены».

Наступны перыяд развіцця маладзёжнага друку ў Беларусі звязаны з палітыкай нацыянальнага адраджэння, якая прадугледжвала развіццё беларускай мовы і літаратуры і традыцыйнай беларускай культуры. З сярэдзіны 20-х гадоў беларускі друк амаль поўнасцю быў пераведзены на беларускую мову і ў першую чаргу маладзёжныя – газета «Чырвоная змена» і часопіс «Малады араты».

У гэты час адбылася дыферэнцыяцыя маладзёжнага друку па катэгорыях чытачоў. Былі створаны газеты і часопісы для дзяцей малодшага ўзросту – часопіс «Зоркі» – 1921 г., выданні для школьнікаў і членаў піянерскай арганізацыі – часопіс «Беларускі піянер» – 1924 г., газета «Юный строитель» – 1923 г. і інш.; газеты і часопісы для студэнтаў – газета «Белорусский студент» – 1924 г., часопіс «Чырвоны сцяг» – 1925 г. і інш.; маладзёжныя літаратурныя часопісы ў многіх гарадах Беларусі – «Аршанскі маладняк», «Слуцкія песняры», «Дняпроўскія ўсплёскі» (Магілёў) і інш.

Нацыяналізацыя ў Беларусі прадстаўляла сабой складаны і часта супярэчлівы працэс. Аднак палітыка беларускага ўрада была нкіравана на тое, каб працэс адраджэння беларускіх традыцый не перашкаджаў, а спрыяў развіццю нацыянальных меншасцяў. У БССР. было заканадаўча ўстаноўлена функцыянаванне чатырох дзяржаўных моў: беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай. На ўсіх гэтых мовах друкаваліся маладзёжныя выданні.

У 1938 г. была створана другая вядомая грамадска-палітычная беларуская газета на рускай мове «Сталинская молодёжь» (з 1956 г. – «Знамя юности»). На польскай мове друкавалася газета «Звязда маладзёжы» («Зорка моладзі») – 1922–1927 гг., якая распаўсюджвалася па ўсёй тэрыторыі СССР, на яўрэйскай –

газеты «Юнгер арбэтэр» («Малады рабочы») – 1922–1936 гг., і газета «Юнгер ленінец» («Юны ленінец») – 1929–1938 гг. і інш.

Такім чынам да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі склалася шырокая сетка маладзёжных выданняў разлічаных на ўсе рознаўзроставыя катэгорыі чытачоў. Шырока папулярнымі былі газеты «Чырвоная змена» і «Піянер Беларусі», якія ператварыліся ў масавыя і аўтарытэтныя сярод чытачоў беларускія выданні. Маладзёжная прэса выконвала важныя сацыяльныя функцыі выхавання і агульнай адукацыі юнакоў і дзяўчат, развіцця нацыянальнай культуры і арганізацыі дзяцей і моладзі ў піянерскай і камсамольскай арганізацыях.

Папулярнасць маладзёжнага друку была звязана таксама з спецыфікай чытацкай аудыторыі, якая імкнулася да грамадска-палітычнай і культурнай інфармацыі, да адукацыі і творчасці. Пагэтаму кожнае новае выданне сустракалася з зацікаўленасцю і інтарэсам і вабіла да сябе юнакоў і дзяўчат. У 20-я і 30-я гады ў БССР узнік і развіваўся масавы рабселькораўскі рух, удзельнікамі якога ў першую чаргу былі юнакі і дзяўчаты, якія бачылі ў супрацоўніцтве з камсамольскімі выданнямі сродак свайго творчага і грамадскага самавыражэння. З многіх рабселькораў «выраслі» вядомыя беларускія журналісты і пісьменнікі.

Маладзёжны друк стаў важнай і неад’емнай часткай усёй сістэмы нацыянальнай прэсы. Паступова склалася ўстойлівая тыпалогія юнацкіх газет і часопісаў, быў накоплены спецыфічны прафесійны вопыт работы журналістаў з маладзёжнай аудыторыяй. Найбольш вядомыя беларускія публіцысты і пісьменнікі часта друкавалі свае творы на старонках дзіцячых і маладзёжных газет і часопісаў. Сярод іх К. Чорны, П. Трус, К. Крапіва, А. Аляксандровіч, П. Галавач, З. Бядуля, П. Броўка і многія інш.

У газетах «Чырвоная змена», «Знамя юности» і часопісе «Маладосць» была склалася таленавітая патрыятычная публіцыстыка, якая становча і моцна ўпдывала на станаўленне грамадзянскай пазіцыі і фарміраване маральна-этычнага вобліку беларускай моладзі Беларуская маладзёжная прэса назапасіла

вялікі вопыт выхавўчай, культурна-асветнай і арганізацыйнай работы сярод модладзі, які карысны для вывучэння і выкарыстання ў нашы дні.